МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
БЕЛАРУСКІ ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА
ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

Гістарычны факультэт
Кафедра гісторыі Беларусі

# МЕТАДЫЧНЫ ДАВЕДНІК

па курсу "Гісторыя Беларусі"

для студэнтаў спецыяльнасці Г.05.01

Мінск 1994

Аўтары-складальнікі: А.П.Ігнаценка, доктар гістарычных навук, прафесар.
В.Р.Рудкін, кандыдат гістарычных навук, дацэнт

Зацверджана на савеце гістарычнага факультэта 24 снежня 1993 г., пратакол № 4.

Прызначана для студэнтаў I курса дзённага і завочнага аддзяленняў.

У даведніку ў храналагічнай паслядоўнасці даецца кароткае апісанне найбольш выдатных твораў асветы, пісьменнасці, арыгінальнай і перакладной літаратуры, архітэктуры, жывапісу і прыкладнога мастацтва.

## КУЛЬТУРА СТАРАЖЫТНАЙ БЕЛАРУСІ X-XIII СТ.СТ. (Хроніка).

### АСВЕТА І ПІСЬМЕННАСЦЬ.

| | |
|---|---|
| ? - 1001 г. | Князь Ізяслаў - першаасветнік Полаччыны, які паводле Ніканаўскага летапісу (XVI ст.) "прилежаще прочитанию божественных писаний." У Ноўгарадзе знойдзена яго пячатка з надпісам: ("ИЗАС(ЛАВ)ОС) - першы помнік усходнеславянскай пісьменнасці. |
| Сярэдзіна XI ст. | Пячатка князя Ізяслава з надпісам "ДИМИТРИОС" (яго кананічнае імя), старэйшага сына Яраслава Мудрага, які княжыў у Тураве, а пасля смерці бацькі (1054 г.) стаў вялікім кіеўскім князем. Знойдзена ў Ваўкавыску. |
| Сярэдзіна XI ст. | Бібліятэка полацкага Сафійскага сабора, у якой знаходзілася вялікая колькасць старажытных кніг і дзе, паводле меркаванняў шэрагу даследчыкаў, пісаліся і перапісваліся кнігі і летапісы. |
| XI ст. | Каменная пліта з надпісам: "Давид Тума, Микула и Копысь", а таксама плінфа з надпісам: "Я - авфони", знойдзены пры рэстаўрацыі полацкага Сафійскага сабора. |
| XI ст. | Фрагмент амфары з надпісам: "...РОПОЛЧЕ ВИНО" (Рополче вино) і шыферная праселка з надпісам: "НАСТАСИНО ПРЯСЛЪНЬ". Знойдзены ў Пінску. |
| Канец XI - пачатак XII ст. | Шыферная праселка з надпісам "БАБИНО ПРЯСЛЕНЬ". Знойдзена ў Віцебску. |
| Каля 1120 - 1173 гг. | Жыццё і дзейнасць унучкі полацкага князя Усяслава Брачыслававіча Ефрасінні Полацкай, якая пасяліўшыся "в голубници" полацкага Сафійскага сабора, "И нача книги писати своими руками". У заснаваным ёю жаночым манастыры адкрыла школу для дзяўчынак. |
| 1161 г. | Крыж Лазара Богшы. Унікальны помнік прыкладнога мастацтва і пісьменнасці. На крыжы выгравіраваны імя і прозвішча майстра, імя заказчыцы - Ефрасінні |

| | |
|---|---|
| | Полацкай, сума выдаткаў на каштоўныя металы і камяні, кошт аплаты працы Лазара Богшы, укладны надпіс. |
| ХП ст. | Пячатка Ефрасінні Полацкай з надпісам: "ИЕФРОСІНЯ Г(ОСПОДИ ПОМОЗИ РАБЕ СВОЕЙ ЕФРОСИНИ НАРЕЦАЕМОЙ". Знойдзена ў Ноўгарадзе. |
| ХП ст. | Пячатка маці Ефрасінні Полацкай з надпісамі: "АГІЯ СОФИЯ" (святая Софія) і "АГІОС ГЕОРГІОС" (святы Георгій). Знойдзена у Кукенойсе (Латвія). |
| ХП ст. | Помнікі эпіграфікі. У Заходняй Дзвіне, ніжэй Полацка, знаходзіліся чатыры вялікія валуны з высечанымі на іх шасціканцовымі крыжамі і надпісамі. На адным з іх, перавезеным у 1981 г. да полацкага Сафійскага сабора, высечаны крыж і надпіс: "Х.С. НИКА. ГІ ПОМОЗІ РАБУ СВОЕМУ БОРИСОУ."<br>У рэчышчы Заходняй Дзвіны ляжалі яшчэ два камяні з надпісамі "СУЛИБОРЪ ХРЪСТ" і "СВЯТОПОЛК-АЛЕКСАНДР."<br>Камень з надпісам: "ГИ ПОМОЗИ РАБУ СВОЕМУ БО(Р)ИСУ МЬНОГО Л(ЕТА)" знаходзіўся каля вёскі Высокі Гарадзец Талачынскага раёна. |
| ХП ст. | Надпіс на амфары з Навагрудка: "ОЛЪКСЪИ" (Аляксей). |
| ХП ст. | Надпіс на сцяне кіеўскага Сафійскага сабора: "ВОИНЕГЪ ПИСАЛЪ ЖУРЯГОВИЦЬ ПОЛОЦЯНИН." |
| ХП-ХШ ст.ст. | Шыферныя праселкі з надпісамі: "НИКА", "КНЯЖИН". Знойдзены ў Друцку. |
| Канец ХП - пачатак ХШ ст. | Самшытавы грабеньчык з выразаным алфавітам. З аднаго боку размешчаны літары ад "А" да "Е", з другога - ад "Ж" да "Л". Першы своеасаблівы "азбукоўнік" на Беларусі. Знойдзен у Брэсце. |
| Пачатак ХШ ст. | Мсціслаўская берасцяная грамата. Зберагліся фрагменты тэксту: "НЦЕ ПОЛУЧЯТЬ ГРНВИ" - у верхнім радку і слова "ОСМЬНАД(ЦАТЬ)" - у ніжнім. Знойдзена ў 1980 г. |



| | |
|---|---|
| Канец ХШ - пачатак ХIУ ст. | Віцебская берасцяная грамата. Яе тэкст: "ОТ СТЕПАНА КЪ НЕ ЖИЛОВИ, ОЖЕ ЕСИ ПРОДАЛЪ ПОРТЫ, А КОУПИ МНЕ ЖИТА ЗА 6 ГРИВЕН, АЛИ ЦЕГО ЕСИ НЕ ПРОДАЛЪ, А ПОСЛИ МИ ЛИЦЕМЬ, АЛИ ЕСИ ПРОДАЛЪ, А ДОБРО СЪТВОРЯ УОКОУПИ МИ ЖИТА". Знойдзена ў 1959 г. |

## Л І Т А Р А Т У Р А:

ХІ-ХШ ст.ст. а) Перакладная.

1. Кананічная літаратура. Кнігі свяшчэннага пісання: Евангелле, Апостал, Псалтыр, Біблія.
2. Апокрыфы. Царкоўна-рэлігійная літаратура, якая не ўвайшла ў канон: "Сказанне прарока Данііла", "Жыццё прарока Ільі", "Хаджэнне Агапія ў рай" і інш.
3. Патрыстычная літаратура - творы "айцоў" царквы. Класікамі патрыстычнай літаратуры лічацца Іаан Златавуст, Васіль Вялікі, Рыгор Назіанзін, Рыгор Ніскі, Іаан Дамаскін.
4. Жыціі - творы аб людзях, што мелі пэўныя заслугі перад царквой. Найбольш вядомыя: "Чэцці-Мінеі", "Пралогі", "Жыціе Аляксея, чалавека божага", "Жыціе айца Ніфанта" і інш.
5. Пацярыкі - зборнікі аб жыцці і подзвігах хрысціянскіх манахаў. Найбольшае распаўсюджванне атрымалі Егіпецкі, Рымскі, Скіцкі, Сінайскі і Іерусалімскі пацярыкі.
6. Кнігі прыродазнаўчага характару: "Хрысціянская тапаграфія Кузьмы Індзікаплова", "Фізіёлаг", "Шасціднёвік" і інш.
7. Гістарычная літаратура. Спалучала кампілятыўна-гістарычнае з легендарным. Найбольш вядомыя на Беларусі візантыйскія хронікі Іаана Малалы і Георгія Амартала, "Талковая палея", "Гістарычная палея" і інш.
8. Аповесці. Мастацкія творы гістарычнага або гісторыка-міфалагічнага зместу. Асаблівай па-

пулярнасцю карысталіся аповесці пра Аляксандра Македонскага ("Александрыя") і Траянскую вайну ("Троя").

б) Арыгінальная.

I. Кананічная літаратура.

| | |
|---|---|
| Сярэдзіна XI ст. | Тураўскае Евангелле - самы ранні з захаваўшыхся рукапісных помнікаў на Беларусі. Засталося 10 аркушаў, пісаных уставам на царкоўна-славянскай мове. Знойдзена ў Тураве ў 1865 г. Зберагаецца ў Цэнтральнай бібліятэцы Літоўскай Акадэміі навук. |
| XII-XIУ ст.ст. | Полацкія Евангеллі. Знаходзяцца ў бібліятэцы імя Салтыкова-Шчадрына ў Санкт-Пецярбургу. |
| Другая палова XШ ст. | Аршанскае Евангелле. Знойдзена ў 1812 г. у Оршы. Зберагліся 142 аркушы рукапісу. Знаходзіцца ў бібліятэцы Украінскай Акадэміі навук. |

2. Жыцці.

| | |
|---|---|
| Каля 1091 г. | Жыціе Феадосія Пячэрскага. Напісана Нестарам. Самы ранні помнік старажытнарускай агіяграфічнай літаратуры, прысвечанай апісанню жыцця і дзейнасці Феадосія ў манастыры. Было шырока вядома на Беларусі. |
| Канец XI- пачатак XII ст. | Сказанне аб Барысе і Глебе. Захавалася больш за 170 спісаў. У яго аснову пакладзены падзеі, звязаныя з забойствам Барыса і Глеба, сыноў вялікага князя Уладзіміра, іх братам Святаполкам. Твор карыстаўся вялікай папулярнасцю ў старажытнай Русі. |
| Канец XII - пачатак XШ ст. | Жыціе Ефрасінні Полацкай - найбольш ранні помнік агіяграфічнай літаратуры на Беларусі. Напісана на царкоўна-славянскай мове. Невядомы аўтар апавядае пра жыццё і асветніцкую дзейнасць Ефрасінні Полацкай, першай жанчыны з усходніх славян, якую царква кананізавала ў святыя. Да нашага часу захавалася некалькі яго спісаў, самы ранні з якіх датуецца XIУ ст. |



| | |
|---|---|
| Каля 1240 г. | Жыціе Аўрамія Смаленскага. Напісана манахам Яфрэмам. У цэнтры твора апісанне цяжкіх фізічных і духоўных выпрабаванняў манаха Селішчанскага манастыра (каля Смаленска) Аўрамія. Захавалася ў шматлікіх рукапісных спісах. У "Жыціе" сустракаюцца асобныя беларускія словы. |

3. Аратарская проза.

| | |
|---|---|
| 1037-1050 гг. | "Слова пра закон і дар божы "кіеўскага мітрапаліта Іларыёна. Першы твор павучальнай літаратуры ўзвышана-рытарычнага стылю. |
| ? - пасля 1164 г. | Кліменцій Смаляціч, царкоўны дзеяч і пісьменнік-прапаведнік. Захаваўся яго адзін твор - "Пасланне Фаме прасвітару." Паводле Іпацьеўскага летапісу Кліменцій "бысть книжник и философ, яко же в Русской земли не бяшеть." |
| Каля 1130-1182 гг. | Кірыл Тураўскі, пісьменнік-прапаведнік і царкоўна-палітычны дзеяч, выдатны майстар аратарскай прозы, празваны "Златовустом, паче всех весиявшим на Руси." З яго творчай спадчыны зберагліся „8 слоў" - пропаведзяў, шэраг кано-наў і малітваў-споведзяў. У 1880 г. у Кіеве выйшаў збор твораў Кірылы Тураўскага ў перакладзе на рускую мову. |
| Каля 1185-1187 гг. | "Слова аб палку Ігаравым". Найвышэйшае дасягненне старажытна-рускай літаратуры, шэдэўр сусветнай паэзіі сярэднявечча. У цэнтры твора - апісанне пахода ноўгарад-северскага князя Ігара на палаўцаў. Некалькі старонак прысвечана Полацкай зямлі. Асаблівае месца ў творы займае вобраз полацкага князя Усяслава, які паказан як смелы, умелы і імклівы палкаводзец, герой незвычайных прыгод. У 1910 г. паэтычны пераклад урыўка са "Слова" пра смерць полацкага князя Ізяслава зрабіў М.Багдановіч. Першы поўны высокамастацкі празаічны пераклад на беларускую мову належыць Я.Купалу (1919 г.). |

### 4. Летапісы

**Пачатак XII ст.** — Аповесць мінулых гадоў. Напісана манахам Кіева-Пячорскага манастыра Нестарам. Твор збярогся ў шматлікіх рэдакцыях і спісах. У "Аповесці" апавядаецца аб рассяленні ўсходніх славян, іх побыце і норавах, іх гераічнай барацьбе супраць ворагаў і г.д. Захаваліся унікальныя звесткі з гісторыі Полацка і Полацкай зямлі.

**XII ст.** — Полацкі летапіс. Не збярогся. Лічаць, што расійскі гісторык В.М.Тацішчаў карыстаўся адным са спісаў полацкага летапісу пры напісанні "Гісторыі Расійскай".

**XII ст.** — Кіеўскі летапіс. Захаваўся ў Іпацьеўскім летапісу. У ім збераглісся каштоўныя звесткі пра падзеі ў Полацкай зямлі ў сярэдзіне XII ст., якія паводле меркавання асобных даследчыкаў, з'яўляюцца фрагментамі згубленага Полацкага летапісу.

**XIII ст.** — Галіцка-Валынскі летапіс. Ёсць звесткі пра утварэнне Вялікага княства Літоўскага і дзейнасць яго першых князёў.

## А Р Х І Т Э К Т У Р А

**Сярэдзіна XI ст.** — Полацкі Сафійскі сабор. Храм шмат разоў перабудоўваўся. Полацкая Сафія належала да тыпу крыжова-купальных храмаў. Па структуры плана блізкая да наўгарадскай Сафіі. Сцены сабора складзены з каменю і плінфы ў тэхніцы паласатай муроўкі.

**Другая палова XI-пачатак XII ст.(?)** — Мінская замкавая царква. Пабудавана часткова. Закладзен толькі падмурак.

**Першая палова XII ст.** — Благавешчанская царква ў Віцебску. Крыжова-купальны храм, выцягнуты ўздоўж. Збудавана з плінфы і каменю. Рады каменных блокаў чаргаваліся з радамі плінфы. Разбурана ў 1961 г.



Засталіся рэшткі сцен.

**Сярэдзіна XII ст.** — Полацкая Спаса-Ефрасіннеўская царква, пабудавана дойлідам Іаанам. Храм узведзены з плінфы ў тэхніцы паласатай муроўкі і прадстаўляе сабой шасцістоўпную крыжова-купальную пабудову.

**Сярэдзіна XII ст.** — Царква ў Ваўкавыску. Пабудавана часткова. Закладзен толькі падмурак.

**Сярэдзіна - другая палова XII ст.** — Навагрудская царква. Чатырохстоўпны храм з трыма апсідамі. Пабудаваны ў той жа тэхніцы, што і Благавешчанская царква ў Віцебску. Прылягаючая да царквы галерэя зроблена ў полацкай тэхніцы паласатай муроўкі. Не збераглася.

**Сярэдзіна - другая палова XII ст.** — Царква ў Тураве - шасцістоўпны трохапсідны храм. Не збераглася.

**Канец XII ст.** — Гродзенская Барысаглебская (Каложская) царква. Сцены выкладзены з чырвонай плінфы, унутры якіх умураваны гаршкі-галаснікі. Звонку сцены дэкарыраваны адшліфаванымі камянямі і крыжамі з паліўных керамічных плітак. Захавалася часткова.

**XII ст.** — На тэрыторыі Бельчыцкага Барысаглебскага манастыра (прадмесце Полацка) пабудаваны ў тэхніцы паласатай муроўкі Барысаглебская, Пятніцкая і дзве царквы, назвы якіх невядомыя. Не збераглісся.

**1276-1288 гг.** — Камянецкая (Белая) вежа. Пабудавана дойлідам Аексам па заказу Валынскага князя Уладзіміра Васількавіча. Круглая ў плане; мураванае збудаванне вышынёй каля 30 м., таўшчыня сцен - 2,5 м.

**XIII ст.** — У Полацку, Тураве, Навагрудку, Гродне, Брэсце пабудаваны вежы-данжоны. Не збераглісся.

## Ж Ы В А П І С.

**Сярэдзіна XI ст.** — Насценны жывапіс Полацкага Сафійскага сабора. Збераглісся рэшткі фрэсак ад першапачатковай

| | |
|---|---|
| | пабудовы храма. Жывапіс сведчыць аб сувязях з кіеўскай мастацкай традыцыяй. |
| Сярэдзіна XI ст. | Тураўскае Евангелле. Малюнак літар вытанчаны, колер карычневата-каштанавы. Мяркуецца, што Евангелле было багата аздоблена мініяцюрамі. |
| Сярэдзіна XII ст. | Фрэскі полацкай Спаса-Еўфрасіннеўскай царквы. Раскрыты больш за 20 фрагментаў насценнага жывапісу, у якім адчуваецца візантыйска-кіеўская аснова. |
| XII ст. | Фрэскамі ўпрыгожаны храмы Бельчыцкага Барысаглебскага манастыра (прадмесце Полацка), а таксама цэрквы Благавешчанская (Віцебск), Барысаглебская (Навагрудак), Барысаглебская (Каложская. Гродна). |
| Другая палова XIII ст. | Аршанскае Евангелле. Зберагліся дзве застаўкі, звыш 300 ініцыялаў, а таксама дзве мініяцюры з выявамі Лукі і Матфея - адны з першых вобразаў евагнелістаў ва ўсходнеславянскіх рукапісах. |

ПРЫКЛАДНОЕ МАСТАЦТВА

| | |
|---|---|
| Сярэдзіна XII ст. | Бронзавы абразок з адлюстраваннем святых Барыса і Глеба. Знойдзены ў Копысі. |
| Сярэдзіна - другая палова XII ст. | Срэбныя з пазалотаю колты, упрыгожаныя перагародчатай эмалью. Знойдзены ў вёсцы Вішчын Гомельскай вобласці. |
| XII ст. | Медныя пазалочаныя пласціны алтарнай перагародкі з гравіраванымі выявамі святога Феадота(?), Паўла, Сімяона. Знойдзены ў Гродні. |
| XII ст. | Абразок з Мінскага замчышча з выявай святых Міколы і Стэфана. |
| XII ст. | Абразок з Полацку з выявай святых Канстанціна і Алены. |
| XII ст. | Залаты бранзалет са стылізаванымі галоўкамі змей на канцах. Знойдзен у Мінску. |



| | |
|---|---|
| XII ст. | У Ніжняй царкве ў Гродні зроблена цудоўная маёлікавая падлога з набору жоўтых, зялёных і карычневых плітак 17 фасонаў. |
| 1161 г. | Крыж майстра-ювеліра Лазара Богшы, зроблены па заказу Ефрасінні Полацкай. Мастацкія якасці крыжа, тэхнічны ўзровень эмалевага дэкору не уступаюць лепшым узорам візантыйскага прыкладного мастацтва. |
| XII-XIII ст.ст. | Шахматныя фігуры караля (Берасцейская гарадзішча), ферзя (Лукомль), ладдзі (Гродна, Ваўкавыск), пешкі (Ваўкавыск). Усе шахматныя фігуры вельмі блізкія паміж сабой па выкананню і апрацоўцы. |

Вучэбнае выданне

Ігнаценка Аляксандр Пятровіч
Рудкін Валянцін Рыгоравіч

Метадычны даведнік
па курсу "Гісторыя Беларусі"

Адказны за выпуск В.Р.Рудкін

Падпісана да друку 28.02.91. Фармат 60х84/16. Папера друк.№3.

Друк афсетны. Умоўн.друк.арк. 0,69 Умоўн.фарбаадбіт. 0,69.
Ул.-выд.арк. 0,6. Тыраж 200 экз. Заказ № 107. Бясплатна.

Белдзяржуніверсітэт. 220050, Мінск, пр.Ф.Скарыны, 4.
Надрукавана на ратапрынце Белдзяржуніверсітэта.
220050, Мінск, Бабруйская, 7.